УДК 351.74(09)

*А.А. Радаман*

,

XVI .

Да сістэмнай рэформы дзяржаўнага ладу ВКЛ 60-х гг. XVI ст. функцыі па забяспячэнню правапарадку і выкананню судовых рашэнняў часцей за ўсё ўскладаліся ў Вялікім Княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім на дзецкіх [1],замкавых конных слуг [2], а таксама на віжоў (якія прызначаліся з ліку персанальных слуг службовых асоб вялікакняжацкай адміністрацыі) [3]. Паколькі дзецкімі і віжамі былі не толькі прадстаўнікі шляхты, але часам і «люди простые» (гайдукі, мяшчане, цяглыя сяляне, а часам і халопы), на соймах 1544, 1547 і 1551 гг. шляхта патрабавала, каб паліцэйскія функцыі здзяйснялі на сталай аснове толькі прадстаўнікі прывілеяванага шляхецкага стану [4].

У канцы XV – першай палове XVI ст. у Падляшшы, Вільні і асобных паветах Трокскага ваяводства з’яўляецца таксама земская пасада войскага, якая надавалася толькі шляхціцам (так у Драгічыне войскі згадваецца ўпершыню ў 1495 г., у Бельску 31 мая 1511 г., у Берасці ў 1516 г., Пінску ў 1524 г., у Горадні 29 кастрычніка 1529 г., у Мельніку ў 1530 г., у Вільні 6 лютага 1533 г., у Камянцы да 1541 г. (1533), у Кобрыне да 1557 г.) [5]. Войскія вызваляліся ад вайсковай службы ў час склікання шляхецкага паспалітага рушэння і былі абавязаны клапаціцца пра бяспеку шляхты і забяспечваць грамадскі парадак на тэрыторыі павета і належны стан захаванасці маёмасці шляхты, якая знаходзілася ў войску. У паветах іншых ваяводстваў ВКЛ войскія з’явіліся ў час сістэмнай рэформы дзяржавы Жыгімонта Аўгуста ці яшчэ пазней (напрыклад, у Полацку 27 ліпеня 1586 г.) [6]. Так, у паветах Навагародскага ваяводства (Навагародскім, Слонімскім і Ваўкавыскім) пасада войскага фіксуецца ўпершыню ў Слоніме ў 1536 г. [7], калі Слонімскі павет уваходзіў яшчэ ў склад Трокскага ваяводства. У Навагародку пасада войскага з’яўляецца ў верасні 1566 г. [8], а ў Ваўкавыску першая вядомая нам згадка войскага датуецца 1594 г. [9] У іерархіі земскіх павятовых пасад установленай соймавай ухвалай 3 студзеня 1567 г. пасада войскага лічылася больш высокай, чым пасада земскага суддзі [10], аднак з 1589 г. у адпаведнасці з арт. 6 III раздзела Статута ВКЛ 1588 г. войскі на сойміках павінен быў выказвацца пасля не толькі суддзі, але і падсудка земскага суда [11].



Пасля судовай рэформы Жыгімонта Аўгуста 1564–1570 гг. функцыі віжоў здзяйснялі павятовыя возныя з ліку шляхты, аднак у актах правапрымянення і судовых кнігах некаторых паветаў ВКЛ дзейнасць віжоў у выпадку «*недостатку возного*» зафіксавана і пасля названай рэформы. У той жа час Статут ВКЛ 1588 г. дапускае замяшчэнне віжом вознага толькі ў выпадку неабходнасці затрымання злодзея з «*лицом*» ці забойцы адразу пасля ўчынення злачынства (Р. XIV, арт. 4) [12]. Парадак выбрання і кампетэнцыя возных вызначаліся Статутамі (Статут 1566 г., р. IV, арт. 4–6 [13]; Статут 1588 г., р. IV, арт. 8–11 [14], а таксама р. I, арт. 9, 23, 24, р. III, арт. 6, 9, 30, 47, р. IV, арт. 5, 6, 15–20, 23, 27–30, 39, 42, 47, 48, 53, 64, 66, 67, 81, 84, 92–96, 98–100, р. VI, арт. 4, 13, р. IX, арт. 3, 5, 6, 18, 21, 22, 24, р. X, арт. 1, 5, р. XI, арт. 2, 5, 19, 26, 29, 32, 40, 42, 47, 57, 62, 63; р. XII, арт. 15, 22, 24; р. XIII, арт. 2; р. XIV, арт. 1, 2, 4–6, 9, 12, 21, 26, 33 [15]). У адпаведнасці з законам у паветах Навагародскага ваяводства возныя выбіраліся на павятовых сойміках, пасля чаго атрымлівалі патэнты на пасаду («*вряд возновский*») ад ваяводы навагародскага, які быў абавязаны «*постригать*» возных [16]. Так, 8 ліпеня 1589 г. навагародскі ваявода Мікалай Радзівіл пры прызначэнні на пасаду слонімскага вознага С. Паўлавіча адзначаў у лісце, скіраваным да слонімскай шляхты, што «*за писаньем, так и за жаданьем ваших милостей всих вобце: суду земского, яко и суду гродского, иих милостей панов шляхты обывателей повету Слонимского, моих ласкавых панов и прыятелей, згодне на то од ваших милости обраного, пострыглом и пры том ураде возновским поставилом урожоного Станислава Павловича з Радивилович, который водлуг права посполитого и Статуту земского прысягу передо мною, яко то был повинен учинити, выконал. О чом ваша милость ведаючи, абысте его ваша милость, яко возного тамошнего повету слонимского везде на справы земские для отправованя посылали*» [17]. На тэрыторыі павета, у якім былі выбраны, возныя выконвалі функцыі кур’ераў, судовых выканаўцаў (прыставаў), а таксама натарыяльныя і паліцэйскія функцыі, у тым ліку былі абавязаны затрымліваць на месцы ўчынення супрацьпраўных дзеянняў злачынцаў, праводзіць дазнанне, канваіраваць затрыманых у месцы ізаляцыі і будынкі судоў [18]. Закон гарантаваў недатыкальнасць асобы вознага. За знявагу вознага Статутам 1588 г. была прадугледжана «навязка» (грашовы штраф) і 12-тыднёвае турэмнае зняволенне, а за яго забойства – «*головщизна*» і пакаранне смерцю [19]. Акрамя таго, арт. 6 р. III Статута 1588 г. прадугледжваў, што возныя «*для послуг земских от службы военной вольни быти мають*» [20]. Такім чынам, возныя вызваляліся ад асабістага ўдзелу ў паспалітым рушэнні ў час вайсковых дзеянняў. За хлусню пры афі-



https://elib.amia.by

цыйным сведчанні возны караўся смерцю, а за іншыя праступкі 12-тыднёвым пазбаўленнем волі і грашовым штрафам [21]. Статут ВКЛ 1588 г. прадугледжваў таксама ўвядзенне з 1589 г. ва ўсіх паветах пасады вознага *«енерала»* (у Жамойці – двух) як начальніка ўсіх возных пэўнага павета (р. IV, арт.104) [22]. Кандыдатура на пасаду вознага-генерала прадстаўлялася шляхтай павета на зацвярджэнне не ваяводзе, а манарху. Як адзначае Вітальд Сянкевіч, часам вознымі-генераламі Навагародскага павета былі зямяне, якія знаходзіліся ў васальнай залежнасці ад прадстаўнікоў нясвіжскай і біржанскай ліній Радзівілаў [23]. У XVII ст. насуперак норме Статута ВКЛ 1588 г. не толькі ў Жамойці, але і ў некаторых іншых паветах ВКЛ адначасова дзейнічалі некалькі возных-генералаў. Так, у Слонімскім павеце ў 1607 г. пасля выбрання кандыдатам на другое ў павеце «генеральства» вознага Дзмітра Дзешуковіча мясцовая шляхта пісала манарху: *«а заживаючи в том прыкладу братьи своее станов Короны Польское, которые догажаючы с правом и потребам своим же бы се тым снадней отправовати могли не под личбою таковых возных енералов зажываюгь, але только яко того потребу быть розумеют»* [24]. У адрозненне ад звычайных возных свае функцыі возныя-генералы мелі права здзяйсняць на тэрыторыі ўсёй дзяржавы.

У выключных выпадках, калі ўзнікалі цяжкасці з прыцягненнем правапарушальнікаў шляхецкага стану да юрыдычнай адказнасці, закон прадугледжваў удзел у спецыяльных аперацыях па падтрыманню правапарадку павятовага шляхецкага рушэння (апалчэння, ці, па сутнасці, шляхецкай «міліцыі»). У адпаведнасці з арт. 67 *«О отправах речей сужоных»* р. IV Статута ВКЛ 1566 г. павятовае шляхецкае рушэнне павінна было збірацца для ўдзелу ў аперацыях па падтрыманню грамадскага парадку як па непасрэднаму загаду манарха, так і па рашэнню ваяводы або старосты ці іх намеснікаў (падваяводы, падстаросты), *«з рамени»* вялікага князя (дзейнічала дадзеная норма да 3 сакавіка 1578 г.) [25]. Так, 6 кастрычніка 1569 г. Жыгімонт Аўгуст выдаў ліст да земянаў Ваўкавыскага павета, каб гродскаму суду *«на помочи были»* у справе затрымання і ўзяцця пад стражу *«в везенье»* ў маёнтку Петухова Мацея Янавіча Клочкі, *«яко противного»* монарху [26]. У 1570–1571 гг. вельмі гучны розгалас займеў канфлікт паміж Ульянай Багушоўнай Багавіцінаўнай (удавой дарсунішскага, тышкоўскага і межырэцкага дзяржаўцы Івана Іванавіча Гарнастая) і братамі яе мужа Астафіем і Гаўрылам Гарнастаямі, якія доўгі час судзіліся за права валодання замкам і дваром Азярніца і дваром Блізная. Слонімскі замкавы суд, а пазней і гаспадарскі задворны суд прысудзілі названыя маёнткі Астафію і Гаўрылу, аднак У. Багавіцінаўна, якая мела ўплывовых сяброў, не пажадала прызнаць вырак гэтых судоў. 3 сакавіка 1570 г.



адбылася першая выправа паспалітага рушэння слонімскай шляхты на чале з павятовымі ўраднікамі на замак Азярніцу, які меў вельмі добрыя ўмацаванні, з мэтай *«увезати»* братоў Гарнастаяў ва ўладанне. Шляхецкае апалчэнне павета, якое налічвала больш за 170 узброеных шляхціцаў, сустрэла моцны супраціў абаронцаў замка. Так, быў падстрэлены з гакаўніцы слонімскі возны Ждан Васілевіч. Да наступнай выправы паспалітага рушэння Азярніца была падрыхтавана яшчэ лепш. 1 верасня 1571 г. князь Аляксандр Палубінскі прывёз у замак гарматы і гакаўніцы, *«росправив»* іх, але сам з замка ад'ехаў. Узначальваў абарону ўраднік князя слуцкага Юрыя Юр'евіча Алелькавіча Леў Лянткоўскі, які атрымаў загад ад свайго гаспадара маёнткі бараніць *«до горла»*. У нядзелю 2 верасня 1571 г. пад Азярніцу рушыла шляхта ўжо ўсіх трох паветаў ваяводства на чале з мясцовымі ўраднікамі і прадстаўнікамі роду Гарнастаяў. Увесці ва ўладанне замкам Гарнастаяў павінен быў навагародскі кашталян і слонімскі староста Грыгорый Валовіч. Разам з ім ўзначальвалі шляхецкае рушэнне ваявода берасцейскі і староста ваўкавыскі Юры Васільевіч Тышкевіч, ваявода менскі Гаўрыла Гарнастай і каралеўскі сакратар Якуб Пэнкоўскі. Шляхту сустрэла *«густая стральба з гармат («дел»), гакаўніц і ручніц»* замка. Пасля адступлення была праведзена нарада Грыгорыя Валовіча з удзельнікамі паспалітага рушэння, на якой было вырашана выслаць пасольства да абаронцаў Азярніцы. У склад пасольства ўвайшлі па тры прадстаўнікі і ад кожнага павета і па аднаму вознаму ад кожнага павета ваяводства (разам 12 чалавек). Лянткоўскі адмовіўся падпарадкавацца патрабаванням Валовіча і выраку гаспадарскага суда. Была прадпрынята яшчэ адна спроба ўзяць замак, аднак абаронцы адкрылі яшчэ больш моцную стральбу, і шляхецкае рушэнне павінна было адысці, пра што 3 і 4 верасня паведамілі манарху Г. Валовіч і Я. Пэнкоўскі [27].

Рэгіянальныя шляхецкія карпарацыі былі зацікаўлены ў падтрыманні правапарадку ў першую чаргу на тэрыторыі свайго павета. У сувязі з гэтым на павятовых сойміках неаднаразова ўздымаліся пытанні, звязаныя з названай праблематыкай [28]. Так, ужо ў час першага бескаралеўя ў верасні 1572 г. у Навагародскім павеце адна крымінальная справа была разгледжана па сутнасці непасрэдна на пасяджэнні сойміка, а ў 1573 г. у Навагародку была завязана каптуровая канфедэрацыя павятовай шляхты з мэтай падтрымання правапарадку і быў створаны надзвычайны каптуровы шляхецкі суд у складзе земскага суддзі Мальхера Жыгімонтавіча Сноўскага, падсудка Есіфа Іванавіча Галаўні, земскага пісара Каспара Керсноўскага і чатырох дэпутатаў, выбраных на сойміку: Фёдара Скуміна-Тышкевіча, Гераніма Макавецкага, Міхала Тугаthroughоўскага і Богуша Аўсянага [29]. У 1587 г. навагародскі каптуровы суд быў створаны ў адпаведнасці з агульна-



https://elib.amia.by

дзяржаўным законам, прынятым на Галоўным дзяржаўным з’ездзе ў Вільні 29–31 студзеня 1587 г. [30]. У склад названага суда, які дзейнічаў у 1587–1588 гг., увайшлі: падкаморы Ян Кунцэвіч, суддзя земскі Е. Галаўня, падсудак К. Керсноўскі, пісар земскі Ян Галаўня, падваявода (намеснік) навагародскі Мікалай Глебавіч Есьман, суддзя гродскі Барташ Брухан (Бруханьскі) і пісар гродскі Аляксандр Палонскі.

Яшчэ ў 1578 г. варшаўскі вальны сойм Рэчы Паспалітай абодвух народаў унёс шэраг змен і дапаўненняў у статутнае заканадаўства ВКЛ. Так, соймавая канстытуцыя 1578 г., якая ўхваліла «*поправы статутовые*», ужо не прадугледжвала магчымасць удзелу шляхецкага паспалітага рушэння ў «*отправах речей сужоных*» [31]. Праект трэцяга Статута ВКЛ, падрыхтаваны ў 1584 г., таксама не ўтрымліваў падобнай нормы і ўскладаў рэалізацыю рашэнняў судоў на «*вряд гродский*». Гэта аднак не пазбавіла рэгіянальныя павятовыя шляхецкія карпарацыі магчымасці супрацы ў справе падтрымання правапарадку ў межах ваяводства. У лютым 1586 г. на грамнічным дэпутацкім сойміку [32] шляхта Ваўкавыскага павета склала ліст да шляхты Навагародскага і Слонімскага паветаў, у якім звярталася з просьбай дапамагчы ў справе ўтаймавання неаселага на той час у Ваўкавыскім павеце Сілы Міхайлавіча Скробата, які абвінавачваўся ў наездзе на маёнтак пана М. Крэменскага і маёнткі іншай павятовай шляхты, а таксама ў нанясенні ран Крэменскаму. Зварот ваўкавыскайшляхты да ўсіх ураднікаў і шляхты ваяводства быў звязаны з *неаселасцю* С. Скробата ў Ваўкавыскім павеце і тым самым з цяжкасцямі, якія ўзнікалі перад павятовымі ўраднікамі ў працэсе прыцягнення названага шляхціца ваяводства да крымінальнай адказнасці. Мэтай звароту было «*яко бы се такое своволенство и морды погамовать могли, а злочинцы караны были*». Падпісалі і прыклалі пячаткі да дакумента 36 шляхціцаў Ваўкавыскага павета [33]. Навагародскія гродскія ўраднікі хутка зрэагавалі на адозву ваўкавыскай шляхты. Падваявода (намеснік) навагародскі М. Есьман узяў Крэменскага пад ахову права і выклікаў у суд Скробата. Паколькі Скробат на пасяджэнне навагародскага гродскага суда не з’явіўся, а да таго ж учыніў «*пахвалку*» на здароўе Есьмана, падваявода навагародскі выклікаў Скробата ў задворны вялікакняжацкі суд. Паколькі Скробат не з’явіўся і на пасяджэнне вялікакняжацкага суда, ён быў прызнаны банітам (выгнаннікам) і асуджаны ў Горадні 2 верасня 1586 г. на «*вызволание*» [34]. З гэтага часу любы шляхціц мог забіць Скробата беспакарана. Пасля смерці вялікага князя Стафана Баторыя і каранацыі Жыгімонта Вазы 28 ліпеня 1588 г. у вялікакняжацкай канцылярыі Скробат засведчыў аднак, што ён ехаў у 1586 г. на пасяджэнне вялікакняжацкага суда, але ў час падарожжа цяжка захварэў, сцвердзіў, што



будзе адстойваць свой гонар у судзе і атрымаў «*поднесение*» – ахоўную грамату, ці «*лист глейтовный*» [35].

Былі аднак выпадкі, калі справу прыцягнення да адказнасці правапарушальнікаў шляхта ваяводства спрабавала выраšыць выкарыстоўваючы неправавыя механізмы. Так, 2 мая 1602 г. шляхта Навагародскага павета звярнулася ў лісце да канцлера ВКЛ Льва Іванавіча Сапегі з просьбай аб дапамозе ў далікатнай справе прыцягнення да адказнасці «сенатарскага сына», які ўчыніў наезд на дом пана Палуяна. Цікава, што ў лісце не згадваецца імя асобы, абвінавачанай ва ўчыненні названага злачынства, верагодна ўжо добра вядомае канцлеру [36].

У прыватнаўласніцкіх маёнтках феадальнай арыстакратыі (слуцкіх князёў Алелькавічаў, князёў Радзівілаў, графаў Хадкевічаў і інш.) функцыі падтрымання правапарадку ўскладаліся часцей за ўсё на васальнае зямянства, а таксама ваенных сялян-слуг (баяры панцырныя, баяры путныя, служкі, выбранцы (гайдукі, пахолкі, жаўнеры, драгуны), часам на адміністрацыйна-гаспадарчых сялян-слуг (войты, цівуны і інш.), а таксама возных патрыманіяльных судоў [37].


1. Земскі прывілей Уладзіслава-Ягайлы ад 20 II 1387 г. («justiciarius») (LietuvosMetrika = LithuanianMetrica = Литовская Метрика. Kn. 25 (1387–1546). Užrašymų knyga 25 / Lietuvosistorijosinst.; parengė D. AntanavičiusirA. Baliulis,parašė A. Baliulis. Vilnius : Moksloirenciklopedijų leidybosinst., 1998. № 1. P. 35–37 : Privilegiumregis-Wladislaisupercertislibertatibusconcessisincolismagniducatus Lithuaniae, adinstarlibertatumregniPoloniae, ubiiudicesindistrictibusdeputanturetconceduntur (1387)) ; Земскі прывілей Казіміра Ягайлавіча ад 2 V 1447 г. (арт. 12) (Codexdiplomaticus-PoloniaequocontinenturprivilegiaRegumPoloniae, MagnorumDucumLitvaniae, bullae-pontificumnecnonjuraaprivatisdataillustrandisdomesticisrebusgestisinservituraadhucnusquamtypisexarata, abantiquissimisindetemporibususqueadannum 1506 =KodeksdyplomatycznyPolski, obejmującyprzywilejekrólówpolskich, wielkichksiążątlitewskich, bullepapiezkie, jakoteż wszelkienadaniaprywatnemogąceposłużyć dowyjaśnieniadziejówwewnętrznychkrajowychdotądnidzieniedrukowane, odnajdawniejszychczasóważ doroku 1506 / wydanyzastaraniemipracą L. RzyszczewskiegoiA. Muczkowskiego, wzbogaconyprzypisamiaż donr. CVIIprzezA.Z. Helgel.T. I. Warszawa : Drukiem Stanisława Strąbskiego, 1847. P. 333–337. № CLXXXVIII ; Ліст (Судзебнік) Казіміра Ягайлавіча ад 29 II 1468 г. (арт. 11) (Судебник Казимира 1468 г. // Древнейшие государства на территории СССР. Ежегодник. 1988–1989. М., 1991. С. 338); Статут ВКЛ 1529 г. (р. III, арт. 4; р. VI, арт. 3,6,16,27) (Первый Литовский Статут (1529 г.) = PirmasisLietuvosStatutas (1529 m.) / С. Лазутка, И. Валиконите, Э. Гудавичюс. Вильнюс : Марги раштай, 2004. С. 159–160, 183–184, 186–187, 190, 194).

2. Доўнар, А.Б. Сістэма аховы правапарадку на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII вв. / А.Б. Доўнар // Матэр. навук. канф.да 90-годдзя міліцыі Беларусі. Минск : Академия МВД Республики Беларусь, 2007. С. 66–74.

3. Zakrzewski, A.B. Wiż w prawie litewskim XVI w. / A.B. Zakrzewski // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1985. T. XXXVII, z. 2. S. 153–165; Поліщук, В. Врядове виживство в структурі публічно-правових процедур (на матеріалі луцьких замкових книг 1558–1567 рр.) / В. Поліщук // Соціум. Альм. соціальної історії [Київ]. 2002. Вип. 1. С. 79–109; Поліщук, В. Офіційні свідки – вижі луцького замкового уряду в 1561–1567 рр. (особовий




https://elib.amia.by

склад та службове підпорядкування) / В. Поліщук // Соціум. Альм. соціальної історії [Київ]. 2005. Вып. 5. С. 13–39; Поліщук, В.В. Офіційні свідки в структурі Луцького замкового уряду до реформ 1564–1566 років (службове підпорядкування і правові послуги) : автореф. дис. … канд. іст. наук : 07.00.01 – історія України / В.В. Поліщук ; Нац. акад. наук України, Ін-т українознавства ім. І. Крип'якевича, Ін-т народознавства. Київ : Від-во «Логос», 2003. 19, [1] с.

4. Любавский, М.К. Литовско-русский сейм : опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства / М.К. Любавский ; Император. об-во истории и древн. рос. при Московск. ун-те. М. : Типогр. Московск. ун-та, 1900 [на обложке – 1901]. С. 298, 528–529, 548, 550.

5. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego : spisy : w X t. / PAN, Instytut Historii ; red. A. Rachuba. Warszawa : Wydawnictwo «DiG», 2003–<2011>. T. I : Województwo wileńskie : XIV–XVIII wiek / oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, P. Romaniuk, przy współpracy Uł. Jemialianczyka i A. Macuka. 2004. Nr 1131. S. 198; T. II : Województwo trockie : XIV–XVIII wiek / oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, P.P. Romaniuk, A. Haratym, przy współpracy A. Macuka i J. Aniszczanki. 2009. Nr 2434. S. 17, 349; Urzędnicy podlascy XIV–XVIII wieku. Spisy / oprac.E. Dubas-Urwanowicz, W. Jarmolik, M. Kulecki, J. Urwanowicz. Kórnik, 1994 (Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku : spisy : w XI t. / PAN, Biblioteka Kórnicka, Instytut Historii ; pod red. A. Gąsiorowskiego. T. VIII). Nr 286, 700, 1080. S. 61, 97, 127; Boniecki, A. Poczet rodów w Wielkiem Księstwie Litewskiem w XV i XVI wieku. Warszawa, 1887. Spis. S. XLVIII– XLIX; Грушевский, А. Очерк истории Туровско-Пинского княжества в составе Литовско-Русского государства XIV–XVI вв. Киев, … С. 96.

6. Радаман, А. Земскія ўраднікі Полацкага ваяводства (другая палова XVI – першая палова XVII стст.) / А. Радаман, Д. Вілімас, В. Галубовіч // Commentariipolocenseshistorici : Полацкія гіст. запіскі. 2004. Т. I. С. 75.

7. Пасаду слонімскага войскага ў 1536–1541 гг. займаў Грынька Міхайлавіч (Крывы) (Boniecki,A. PoczetrodówwWielkiemKsięstwieLitewskiemwXViXVIwieku. Warszawa, 1887. Spis. S. XLIX). Зг. на пасадзе 20 VII 1540 г. (Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 28 (1522–1552). Кніга запісаў 28 / падрыхт. тэкстаў да друку і навук. апарат : В. Мянжынскі, У. Свяжынскі. Менск, 2000. № 25. С. 75–76). Пасля смерці ў 1576 г. Мікалая Юндзіла слонімскім войскім 31 кастрычніка 1576 г. стаў Аўрам Данілавіч Мялешка (Российский государственный архив древних актов в Москве. Ф. 389 «Литовская метрика» ; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. КМФ-18 «Метрыка ВКЛ». Воп. 1. Адз. зах. 63 (далей: Метрыка ВКЛ 63). Арк. 50–50 адв. ; Метрыка ВКЛ 58. Арк. 77–77 адв.; Лаппо, И.И. Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской Унии до смерти Стефана Батория (1569–1586) : Опыт исследования политического и общественного строя [Т. 1] / И.И. Лаппо. СПб. : Типогр И.Н. Скороходова, 1901 (Записки ист.-филолог. фак. императ. С.-Петерб. ун-та. Ч. 61) (далей: Лаппо, И. ВКЛ I).С. 340). Пасля яго авансу на земскае пісарства пасаду войскага з 14 снежня 1578 г. па 18 сакавіка 1579 г. займаў Іван Мялешка (Метрыка ВКЛ 60. Арк. 263–264 адв.). З 18 сакавіка1579 г. па 1580 г. пасаду войскага зноў займаў Аўрам Данілавіч Мялешка (адначасова пісар земскі) (Метрыка ВКЛ 63. Арк. 185 адв.–186 адв.; Лаппо, И. ВКЛ I. С. 341), але пасля яго намінацыі на гаспадарскае маршалкоўства ў 1580 г. (UrzędnicycentralniidygnitarzeWielkiegoKsięstwaLitewskiegoXIV–XVIIIwieku : Spisy / oprac.H. Lulewicz i A. Rachuba. Kórnik, 1994 (Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku : spisy : w XI t. / PAN, Biblioteka Kórnicka, Instytut Historii ; pod red. A. Gąsiorowskiego. T. XI). № 629.S. 95, 220) да выканання абавязкаў войскага зноў прыступіў Іван Мялешка, які зышоў з пасады ў студзені 1591 г. 22 студзеня 1591 г. войскім слонімскім быў прызначаны Валер'ян Міхайлавіч Сакалоўскі, які знаходзіўся на названай пасадзе да 3 сакавіка 1623 г. (Метрыка ВКЛ 77. Арк. 256–256 адв. ; Метрыка ВКЛ 100. Арк. 47).



8. Земянін ляхавіцкі Аляксандр Брындза быў прызначаны на пасаду новагародскага войскага 6 верасня 1566 г. (Метрыка ВКЛ 48. Арк. 88–89). 16 жніўня 1567 г. вялікі князь Жыгімонт Аўгуст выдаў прывілей на «прилученье под хоругов и присуд повету Новгородского двору ... войского новгородского Александра Бриндзы ... з ыменьем его на Начи»(Метрыка ВКЛ 48. Арк. 134 адв.–136). У 1589 г. Аляксандр Брындза перадаў пасаду новагародскага войскага сыну Давыду. Адпаведны прывілей выдаў вялікі князь Жыгімонт Ваза 18 лютага 1589 г. (Метрыка ВКЛ 73. Арк.647–647 адв.; Метрыка ВКЛ 74. Арк. 515 адв.–516). З 15 мая 1592 г. да пачатку XVII ст. пасаду новагародскага войскага займаў ужо Фёдар Богуш (Багушэвіч) (Метрыка ВКЛ 76. Арк. 222 адв.–223).

9. Шыман Янавіч Цывіньскі, суддзя гродскі ваўкавыскі (1579–1584) быў прызначаны на пасаду войскага Ваўкавыскіага павета. (зг. як суддзя гродскі 31 V 1579 і 13 IX 1584 гг. (Archiwum Państwowe w Krakowie. Archiwum Młynowskie-Chodkiewiczów. Rękopis 10. S. 49; РГАДА. Ф. 356. Воп. 1. Спр. 32. Арк. 259)); згадваецца на пасадзе войскага : 3 XI 1594 г. (LVTS. № 22. S.107); 9 I 1598 г. (НГАБ. Ф. 1926. Воп. 8. Спр. 2. Арк. 149 адв.). † да 7 II 1619 (Метрыка ВКЛ 93. Арк. 278).

10. Максимейко Н.А. Сеймы литовско-русского государства до Люблинской Унии 1569 года. Харьков: Типография А. Дорре, 1902. Приложение. С. 176 ; Лаппо И.И. Великое Княжество Литовское во второй половине XVI столетия. Литовско-русский повет и его сеймик. Юрьев: Типография К. Маттисена, 1911 (далей: Лаппо, И.И. ВКЛ II). С. 549; Zakrzewski A.B. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki. Warszawa: Liber, 2000. S. 57; Rachuba Andrzej. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763. Warszawa: Wydawnictwo Sejmowe, 2002. S. 96.

11. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі / БелСЭ ім. П. Броўкі.; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал.рэд.) і інш. Мн.: БелСЭ, 1989 (далей: Статут ВКЛ 1588 г.). С. 116. Р. III. Арт. 6.

12. Статут ВКЛ 1588 г. С. 332–333.

13. Статут Великого Княства Литовского 1566 года и поправы Статутовые 1578 г. // Временник Император. об-ва истории и древн. рос. при Московск. ун-те. М., 1855. Кн. XXIII. Отд. II : Материалы (далей: Статут ВКЛ 1566 г.). С. 66–68.

14. Статут ВКЛ 1588 г. С. 146–149.

15. Статут ВКЛ 1588 г. С. 85, 93–95, 115, 117, 127, 136, 144–145, 151–163, 170, 172–173, 176–178, 182, 189–193, 199–200, 204–207, 209–210, 227, 232, 252, 254–255, 262–266, 269, 271–272, 277–278, 280, 287, 290, 293, 295–296, 300–301, 303, 306, 309–310, 320, 322–325, 330–338, 341, 343, 345–346.

16. Статут ВКЛ 1588 г. С. 146.

17. НГАБ. Ф. 1785. Воп. 1. Спр. 11. Арк. 92–92 адв.

18. Статут ВКЛ 1588 г. С. 146–147, 332–333.

19. Статут ВКЛ 1588 г. С. 94, 148–149.

20. Статут ВКЛ 1588 г. С. 115.

21. Статут ВКЛ 1588 г. С. 147.

22. Статут ВКЛ 1588 г. С. 212–213.

23. Sienkiewicz, W. Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII wieku : studium z dziejów feudalizmu litewskiego : praca doktorska obroniona 25 V 1983 r. Warszawa : Biblioteka Instytutu Historycznego Uniwersytetu Warszawskiego (maszynopis), 1983. S. 179–181.

24. Метрыка ВКЛ 89. Арк. 20 ; НГАБ. Ф. 1785. Воп. 1. Спр. 22. Арк. 209 адв. – 210 адв.

25. Статут ВКЛ 1566 г. и поправы Статутовые 1578 г. С. 99–100, 207–210.

26. LietuvosMetrika : LithuanianMetrica : Литовская Метрика : Kn. 532 (1569–1571) : Viešųjų reikalų knyga 10 : Кн. публичных дел 10 / Lietuvosistorijosinst., parengė L. Anužytė irA. Balulis. Vilnius : Žara, 2001. № 80, с. 93–94; Лаппо, И.И. ВКЛ II. С. 123–125.



https://elib.amia.by

27. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (далей: AGAD). Archiwum Potockich z Radzynia. Sygn. 389. K. 18, 23–24, 39, 112–113, 116, 321–322, 326. Выказваем шчырую падзяку к.г.н. Н. Сліж за інфармацыю пра выправу шляхты Новагародскага ваяводства пад Азярніцу.

28. Гл., напрыклад : Радаман, А.А. Вайсковыя шляхецкія з'езды (попісы і зборы паспалітага рушэння) Новагародскага павета ў другой палове XVI ст. / А. Радаман // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII ст. : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск – Навагрудак, 23–24 лістапада 2007 г. / навук. рэд. С.Ф. Сокал, А.М. Янушкевіч. – Мінск : БІП-С Плюс, 2008. С. 220–231 ; Радаман, А.А. Прынцыпы забеспячэння бяспекі дзейнасці соймікаў у праве Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага другой паловы XVI – пачатку XVII ст. / А. Радаман // Проблемы борьбы с преступностью и подготовки кадров для органов внутренних дел Респ. Беларусь : сб. материалов науч.-практ. конф., Минск, 28 янв. 2005 г. / под общ. ред. И.И. Басецкого. Минск : Акад. МВД Респ. Беларусь, 2005. С. 136–137.

29. Радаман, А.А. Шляхецкія з'езды і соймікі Новагародскага павета і праблема ўзнікнення каптуровых судоў ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім ў час бескаралеўяў другой паловы XVI ст. / А. Радаман // Вест. Акад. МВД Респ. Беларусь. 2004. № 1 (7). С. 132–136 ; Radaman, A. Samorząd sejmikowy w powiatach województwa nowogródzkiego Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1565–1632 // Praktyka życia publicznego w Rzeczypospolitej Obojga Narodów w XVI–XVIII wieku / Komisja Lituanistyczna przy Komitecie Nauk Historycznych Polskiej Akademii Nauk, Instytut Historii Polskiej Akademii Nauk, Instytut Historyczny Uiwersytetu Warszawskiego, Instytut Historii Prawa Uniwersytetu Warszawskiego ; pod red. U. Augustyniak i A. B. Zakrzewskiego. Warszawa : Neriton, 2010 (далей: Radaman, A. Samorząd sejmikowy). S. 100–101. Падобны суд функцыянаў у Берасцейскім павеце ў 1572–1573 гг., у Полацкім ваяводстве ў 1575–1576 гг. (Lulewicz, H. Funkcjonowanie sądownictwaszlacheckiegowWKsLwokresiepierwszychbezkrólewi (1572–1576) / H. Lulewicz // Z dziejówkulturyprawnej : studia ofiarowane prof. J. Bardachowi wdziewięćdziesięciolecieurodzin / red. M. Wąsowicz [i in.]. Warszawa : Liber, 2004. S. 361–367; Konieczna, D. Wpływsejmikubrzesko-litewskiegonadziałalność sądukapturowegowokresie 1572–1764 / D. Konieczna // Studia historyczno-prawne. Księga poświęcona pamięci Profesora Jana Seredyki / red. W. Kaczorowski ; Uniwersytet Opolski, Katedra historii parlamentaryzmu. Opole : Wydawnictwo Uniwersytetu Opolskiego, 2008. S. 177–187; Радаман, А. Арганізацыя і склад полацкага земскага суда ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. / А. Радаман // Герольд Litherland. 2011. № 18. С. 31–32, 36).

30. AGAD. Archiwum Radziwiłłów. Dział XV. Aktaordynacjinieświeskiej. Teka 13. Plik 15. Akta dziedziczne. Przyście Nieświeża czyli Sołtanowej Haci albo Sołtanowszczyzny od Jana Janowicza Sołtana na dziedzictwo Ks. Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła. S. 26–33 ; Zbiór pomników reformacyi kościoła polskiego i litewskiego. Zabytki z wieku XVI-go/ Staraniem Synodu Jednoty Ewangielicko-Reformowanej Litewskiej. Wilno : Druk A. Ginsa, 1911 (Monumenta reformationis Polonicae et Lithuanicae. Serya I. Zeszyt I).№ 26. S. 124, 128 ; Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego : w 2 t. / Instytut Historii PAN ; oprac. H. Lulewicz. Warszawa : Wydawnictwo Neriton, 2006–2009. T. I : Okresy bezkrólewi (1572–1576, 1586–1587, 1632, 1648, 1696–1697, 1706–1709, 1733–1735, 1763–1764). Warszawa, 2006. Cz. II. 2, nr 72, s. 202–220 ; nr 73, s. 221–234 ; nr 74, s. 235–239; Lulewicz, H.Gniewów o unię ciąg dalszy. Stosunki polsko-litewskie w latach 1569–1588 / H. Lulewicz, Instytut Historii Polskiej Akademii Nauk. Warszawa : Wydawnictwo Neriton, 2002. S. 360–364.

31. У тым жа 1578 г. упершыню законам была прадугледжана магчымасць праваздзення судовага дазнання-следства («шкрутыниума») па найбольш складаных крымінальных справах («где идеть о почтивость и о горло»). Удзельнічаць у правядзенні такога расследавання маглі ваяводы, старосты, іх намеснікі (падваяводы, падстаросты), гродскія суддзі і пісары, камісары гаспадарскага суда з ліку павятовых



урааднікаў і суддзі Трыбунала ВКЛ у абавязковай прысутнасці возных і афіцыйных сведкаў (панятых). Статут ВКЛ 1566 г. и поправы Статутовые 1578 г. С. 210–212 ; Статут ВКЛ 1588 г., р. XI, арт. 61–66. С. 308–311.

32. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582–1696) : spis / podred. A. Rachuby ; oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba ; Instytut Historii PAN. Warszawa : Wydawnictwo «DiG», 2007. S. 71; Lietuvos Vyriausiojo Tribunolo sprendimai : Решения Главного Литовского Трибунала (1583–1655) / parengė V. Raudeliūnas, A. Baliulis ; radkol. V. Raudeliūnas (ats. red.) ir kt. Vilnius : Mintis, 1988 (Lietuvos teisės paminklai ; III). S. 65.

33. Лаппо, И.И. ВКЛ II. С. 534–535. У 1567 г. маці Скробата мела нерухомасць у Ваўкавыскім павеце, а яшчэ 4.04.1584 г. сам С.М. Скробат згаданы як земянін Ваўкавыскага павета (Radaman, A. Samorządsejmikowy... S. 93).

34. Radaman, A. Samorządsejmikowy... S. 94 ; Метрыка ВКЛ 281. Арк. 144 адв. – 147, 148–149. Памылковае ўяўленне пра справу С.М. Скробата меў М.В. Доўнар-Запольскі. Гл. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994. С. 141–142.

35. Radaman, A. Samorządsejmikowy... S. 94 ; Метрыка ВКЛ 279. Арк. 576 адв. – 577 адв.

36. Biblioteka Raczyńskich w Poznaniu. Rękopis 88. K. 96–97v; Radaman, A. Samorządsejmikowy... S. 75.

37. Sienkiewicz, W. Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVI do połowy XVIII wieku : studium z dziejów feudalizmu litewskiego : praca doktorska obroniona 25 V 1983 r. Warszawa : Biblioteka Instytutu Historycznego Uniwersytetu Warszawskiego (maszynopis), 1983. S. 136–147; 160–181; Доўнар, А.Б. Сялянеслугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. Мінск, 2007. С. 27–56, 60–61, 74–75, 79–103, 156–158.

УДК 351.747.1

*А.Д. Гронский*

## 1863–1864 .
## ( )

Подавление любого выступления влечет за собой наказание его участников при условии, что выступившие не одерживают победы. Польское восстание 1863–1864 гг. не является исключением. Арестованных или взятых в плен повстанцев и подозреваемых в сочувствии восстанию власти привлекали к различным видам ответственности. Кстати, эти репрессии были не такими кровавыми, как о них принято говорить. Например, за хранение оружия и запрещенной литературы накладывался штраф в размере 100 рублей серебром, а самого провинившегося отпускали «на благонадежное попечительство» под надзор полиции [4, л. 16–17]. Если повстанца арестовывали с оружием, наказание было более суровым – ссылка на каторжные работы на заводы сроком до четырех лет [5, л. 11]. Некоторые отголоски восстания вообще не влекли за собой никакого наказания. Так, крестьяне Могилевской губернии нашли в лесу, принадлежащему несовершеннолетнему



https://elib.amia.by